**Выбары дэпутатаў
Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь сёмага склікання**

**Аналітычная тыднёвая справаздача па выніках назірання: 26-31 жніўня**

*Назіранне за выбарамі ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца РПГА «Беларускі Хельсінкскі камітэт» і ПЦ «Вясна» ў межах кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары».*

## ВЫСНОВЫ

- Цэнтральная камісія прыняла шэраг пастаноў, якія рэгулююць важныя аспекты выбарчай кампаніі, у прыватнасці, парадак выкарыстання СМІ кандыдатамі ў дэпутаты, парадак дэкларавання даходаў і маёмасці асобамі, вылучанымі кандыдатамі ў дэпутаты, зацверджана Палажэнне аб выбарчым фондзе кандыдата ў дэпутаты і іншае;
- 26 жніўня 2019 г. апублікаваныя апошнія рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў па вызначэнні забароненых месцаў для правядзення пікетавання з мэтай збору подпісаў выбаршчыкаў па вылучэнні кандыдатаў; у большасці выпадкаў пералік забароненых месцаў не будзе ствараць перашкоды працы ініцыятыўных груп, але рашэнні мясцовых уладаў па гэтым пытанні дэманструюць розныя падыходы і ў шэрагу выпадкаў неабгрунтавана шырока і без тлумачэнняў абмяжоўваюць магчымасці збору подпісаў;
- 30 жніўня 2019 г. скончыўся тэрмін вылучэння прадстаўнікоў у склад абласных, Мінскай гарадской, акруговых выбарчых камісій ад палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў і грамадзян шляхам падачы заяў; на сайтах выканкамаў з’явілася інфармацыя пра час і месца правядзення першых арганізацыйных пасяджэнняў па стварэнні камісій;
- адзначана актыўнасць палітычных партый і грамадскіх арганізацый па вылучэнні сваіх прадстаўнікоў у склад выбарчых камісій і накіраванні назіральнікаў; дзяржаўныя друкаваныя і электронныя СМІ практычна не

даюць інфармацыі пра выбары, за выключэннем звестак, публікацыю якіх прадугледжвае ВК;
– назіральнікі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» ў большасці не сутыкаюцца з перашкодамі сваёй дзейнасці на сёлетніх выбарах.

## ПАСТАНОВЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ

28 жніўня адбылося чарговае пасяджэнне Цэнтральнай камісіі, на якім прыняты пастановы, якія тычацца выбарчай кампаніі. У прыватнасці, пастановай № 41 зацверджана Палажэнне аб парадку выкарыстання сродкаў масавай інфармацыі кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў[1]. У параўнанні з папярэднімі выбарамі гэты парадак змяніўся нязначна. Так, скарочаны пералік рэспубліканскіх газет, у якіх кандыдаты ў дэпутаты маюць права апублікаваць сваю праграму. Сёння гэта газеты «Звязда» і «Рэспубліка», раней да іх ліку належала і «Народная газета».

Прадугледжаны алфавітны парадак удзелу кандыдатаў у дэпутаты ў лёсаванні. Для пашырэння магчымасці ўдзелу людзей з інваліднасцю пастаноўлена, што выступы кандыдатаў у дэпутаты павінны суправаджаюцца субтытрамі ці, з улікам магчымасцяў тэлерадыёкампаній, перакладам на мову жэстаў. Як і раней, тэле- і радыёперадачы з перадвыбарнымі выступленнямі кандыдатаў у дэпутаты, а таксама тэледэбаты будуць транслявацца ў запісы.

Пастановай № 42 зацверджана Палажэнне аб Назіральнай радзе па кантролі за выкананнем парадку і правілаў правядзення перадвыбарчай агітацыі ў сродках масавай інфармацыі і яго персанальны склад[2]. У Палажэнні прадугледжана магчымасць прысутнічаць на пасяджэнні Назіральнага савета не толькі членаў ЦВК і работнікаў яе апарату, але і іншых асоб. У сувязі з гэтым варта нагадаць, што падчас папярэдняй выбарчай кампаніі Цэнтральная камісія адхіліла прапанову аб запрашэнні прадстаўніка РПГА “Беларускі Хельсінкскі Камітэт” на пасяджэнні Назіральнага савета. Адмова матывавалася тым, што ўдзел іншых асоб не прадугледжаны выбарчым заканадаўствам. Як і падчас папярэдніх парламенцкіх выбарах, у склад Назіральнай рады быў уключаны старшыня ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» Андрэй Бастунец.

Растлумачаны парадак дэкларавання даходаў і маёмасці асобамі, вылучанымі кандыдатамі ў дэпутаты. У параўнанні з папярэднімі парламенцкімі выбарамі, пералік тых звестак аб маёмасці, непазначэнне або няправільнае ўказанне якіх можа пацягнуць рашэнне аб адмове ў рэгістрацыі, пашыраны. Указанне ў

[1] Даступна на: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2019/post41.pdf
[2] Даступна на: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2019/post42.pdf

дэкларацыі акцый у меншай колькасці, а таксама звесткі пра акцыі, долі (не пацверджанай акцыямі) у статутным фондзе юрыдычнай асобы, якія перададзены ў давернае кіраванне, будуць мець істотны характар, што, у сваю чаргу, можа прывесці да адмовы ў рэгістрацыі.

Пастанова № 43 прадугледжвае, што пры адсутнасці даходу ў кандыдата ў дэпутаты акруговая выбарчая камісія замест публікацыі яго гадавога даходу будзе публікаваць крыніцу сродкаў яго існавання[3]. Яе павінны ўказваць самі тыя асобы, якія вылучаюцца кандыдатамі.

Зацверджана Палажэнне аб выбарчым фондзе кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў[4]. Новаўвядзеннем з’яўляецца магчымасць атрымання кандыдатам у дэпутаты доступу да інфармацыі аб стане яго спецыяльнага выбарчага рахунка з дапамогай сістэмы дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання «Інтэрнэт-банкінг».

## ВЫЗНАЧЭННЕ МЕСЦАЎ, ЗАБАРОНЕНЫХ ДЛЯ ПІКЕТАВАННЯ З МЭТАЙ ЗБОРУ ПОДПІСАЎ ВЫБАРШЧЫКАЎ ПА ВЫЛУЧЭННІ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ПП НС

Рашэнні райвыканкамаў па гэтым пытанні дэманструюць розныя падыходы і часта неабгрунтавана шырока і без тлумачэнняў абмяжоўваюць магчымасці для збору подпісаў. Так, напрыклад, у Брэсцкай вобласці Пружанскі райвыканкам выставіў для палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў і грамадзян самыя жорсткія ўмовы. Тут дзейнічае забарона ўжо на адлегласці менш за 50 метраў ад будынкаў органаў улады, цалкам забаронены збор подпісаў на тэрыторыі чыгуначнага і аўтавакзалаў, на прыпыначных пунктах і інш. Адным з найменш абмежавальных з’явілася рашэнне Івацэвіцкага райвыканкама. Яно прадугледжвае, што месцы, забароненыя для правядзення пікетавання, знаходзяцца на адлегласці менш за 20 метраў ад райвыканкама, аддзела ўнутраных спраў, суда Івацэвіцкага раёна, пракуратуры і раённага аддзела Следчага камітэта. Ва ўсіх астатніх месцах праводзіць пікеты дазваляецца.

У Віцебскай вобласці практычна ўсе раённыя ўлады абмежавалі збор подпісаў на адлегласці бліжэй, чым 20 метраў да будынкаў органаў улады, але некаторыя яшчэ ўнеслі ў спіс тэрыторыі ў 20 метраў да ўстаноў адукацыі (Сенненскі, Пастаўскі, Шумілінскі, Ушацкі), арганізацый аховы здароўя (Віцебскі райвыканкам) і інш.

[3] Даступна на: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2019/post43.pdf
[4] Даступна на: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2019/post44.pdf

У той жа час адсутнасць забароны для збору подпісаў на тэрыторыях прадпрыемстваў і ўстаноў (у прыватнасці, установ адукацыі і аховы здароўя) стварае ўмовы для выкарыстання ў іх адміністрацыйнага рэсурсу па збору подпісаў у інтарэсах праўладных кандыдатаў у дэпутаты.

Разам з тым назіральнікі канстатуюць факты лібералізацыі рашэнняў мясцовых улад у параўнанні з мінулымі кампаніямі. Напрыклад, сёлета Мазырскі райвыканкам зняў шэраг забарон, у тым ліку забарону на пікетаванне на адлегласці меней чым ў 200 метраў ад будынкаў прадпрыемства «Тэлеканал «Мазыр», інфармацыйнага прадпрыемства «Рэдакцыя радыёпраграмы «Нэлі-Інфа», радыётэлевізійных перадаючых станцый і інш.